

**НЕРАТОК Юрась (Гарбачоў Юрый Юр’евіч)**
**(19.09.1961г.)**

Нарадзіўся ў сяле Баяры Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці ў сям’і настаўнікаў-філолагаў. Дзяцінства прайшло ў вёсцы Хадакі Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці.

Пасля заканчэння сярэдняй школы паступіў у Беларускі палітэхнічны інстытут, які закончыў у 1983 годзе. Пасля інстытута пяць гадоў працаваў канструктарам на Мінскім аўтазаводзе, затым перайшоў у НВА “Цэнтр”, дзе працуе зараз начальнікам канструктарскага аддзела.

Першыя вершы надрукаваны ў зэльвенскай раённай газеце “Праца” ў студзені 1996 года. Творчы шлях паэта непасрэдна звязаны з “Зорамі над Зальвянкай”.

Выдадзеныя кнігі: “Пьяный материк” и “Экспедитор” (фантастычная проза, 1999г.), “Абстрактно о конкретном” (вершаваныя байкі, 2000 г.), “Монодия” (2001 г.), “Сон-дежавю”(2002 г.), “Фотаальбом” (2003г.), “Закуцце” (2007 г.), “Непатрэбныя людзі” (2019 г.), асноўны аўтар і складальнік калектыўнага зборніка-алігата “Рэцэпт ад песімізму” (СМС - праект) і “Буслан і Жабміла” (калектыўная электронная паэма) (2012 г.). Адзін з суаўтараў (сумесна з Ірынай Карнаухавай і Марынай Шапавалавай) паэтычнага трыялогу “Заблытаўся сярод навін…” (2017 г.). Прыняты ў Саюз беларускіх пісьменнікаў у 2005 годзе, член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 2008 года, член-заснавальнік народнага клуба паэтаў і кампазітараў “Жывіца” з 2015 года. Адзначаны медалём Саюза пісьменнікаў Беларусі “За вялікі ўклад у літаратуру”(2017 г.). У рускамоўнай літаратуры вядомы пад псеўданімам “Юрый Юлаў”.

Жыве і Мінску.

## Бібліяграфія


1. **«Дыяблог P.S.» Госць: Юрась Нераток, паэт, парадыст (28.02)** [Электронный ресурс]. - Режим доступа: https://www.youtube.com/watch?v=vzJZL0JDSuo. - Дата обращения: 29.11.2022.
2. **Зэльвенскі зарапад** // Марціноўскі, П. М. Каб не пагаслі зоры: Артыкулы. Успаміны. Лісты. Вершы / Петр Марціноўскі. – Мінск: Ковчек, 2022. — С. 12—17.
3. **КНІГА ЮРАСЯ НЕРАТКА “ЗАКУЦЦЕ”** [Электронный ресурс]. - Режим доступа: https://lit-krytyka.livejournal.com/24069.html . - Дата обращения: 29.11.2022.
4. **Нераток, Ю. Моя деревня Ходаки** [Электронный ресурс]. - Режим доступа: https://www.sb.by/articles/moya-derevnya-khodaki.html. - Дата обращения: 29.11.2022.
5. **Чэмер, М. Юрась НЕРАТОК: “Мая спецыяльнасць — вырашэнне невырашальных задач…”** [Электронный ресурс]. - Режим доступа: https://nastgaz.by/yuras-neratok-maya-spetsyyalnasts-v/. - Дата обращения: 29.11.2022.
6. **Юрась Нераток** // Зоры над Зальвянкай: зборнік вершаў / Літ. аб’яд-не “Зоры над Зальвянкай”. — Слонім: Слонімская друкарня, 2008. — С. 78—80.
7. **Юрась Нераток** [Электронный ресурс]. - Режим доступа: https://www.livelib.ru/author/348125-yuras-neratok. - Дата обращения: 29.11.2022.
8. **Юрась Нераток** [Электронный ресурс]. - Режим доступа: https://knigogid.ru/authors/52729-yuras-neratok. - Дата обращения: 29.11.2022.